# ДА ПЫТАННЯ АБ АНТЫГЕРМАНСКІМ РУХУ Ў ГРОДНА

**А.В. Касовіч, Дз.Ч. Качарго**
**БДПУ (Мінск)**

Як сведчаць архіўныя дакументы і мемуарная літаратура, ужо з першых дзен акупацыі ў Гродне распачалася барацьба супраць захопнікаў.

Захоп горада немцамі на другі дзень вайны выключыў магчымасць якой бы то ні было папярэдняй падрыхтоўчай работы па разгортванню барацьбы ў варожым тыле. Не праводзілася яна, як вядома, і напярэдадні вайны. З-за вялікай аддаленасці лініі фронту, якая хутка адсоўвалася на ўсход, тут былі невядомы першыя дырэктывы савецкага кіраўніцтва аб неабходнасці распачаць партызанскую і падпольную барацьбу, сюды не змаглі прыбыць ні ў 1941, ні ў 1942 г. іх арганізатары з савецкага тылу. Таму пачыналі барацьбу з акупаптамі па ўласнай ініцыятыве радавыя камуністы, беспартыйныя патрыеты, якія заставаліся вернымі сваім перакананям, свайму партыйнаму і грамадзянскаму абавязку.

Так, у жніўні 1941 г. у Гродне пачалі дзейнічаць падпольныя групы пад кіраўніцтвам ваеннага інжынера камуніста М. А. Волкава і беспартыйнага актывіста К. Г. Васілюка. Удзельнікі групы вялі антыфашысцкую агітацыю, дапамагалі ваеннапалонным, рыхтаваліся да адыходу ў партызаны. У студзені 1942 г. група была раскрыта і разгромлена. М. А. Волкаў і некаторыя іншыя падпольшчыкі загінулі ў фашысцкіх засценках.

Яшчэ адну падпольную групу ў горадзе арганізаваў у верасні 1942 г. рабочы мясакамбіната В. Д. Разанаў. Спачатку яе асноўныя намаганні былі накіраваны па наладжванне ўзаемадапамогі, згуртаванне ўсіх тых, хто не меў намеру скарыцца акупантам. Праз вусную агітацыю падпольшчыкі падтрымлівалі і ўзмацнялі ў сваіх знаёмых разуменне неабходнасці супрацьдзейнічання ўсім іх мерапрыемствам.

Патрыятычнае падполле ўзнікла і на Гродзенскім чыгуначным вузле. Яго зачынальнікам стаў машыніст лакаматыўнага дэпо камуніст М. М. Багатыроў. Ужо ў ліпені 1941 г. ен, дзейнічаючы ў адзіночку, ажыццяўляе дыверсію на вузле, у выніку якой былі разбіты два паравозы і каля 20 вагонаў. У снежні ім была створана падпольная група, распачаўшая сістэматычную дыверсійную дзейнасць. У студзені 1942 г. у дэпо станцыі Гродна пачала дзейнічаць яшчэ адна падпольная група на чале з Г. І. Святлічным. Па свайму складу яна была камсамольскай. Падпольная дзейнасць яе членаў канцэнтравалася на сабатажы рамонту лакаматываў і іншага чыгуначнага абсталявання.

У пачатку 1942 г. падпольная антыфашысцкая арганізацыя ствараецца і ў Гродзенскім гета. Улічваючы спецыфічныя ўмовы дзейнасці, арганізацыя асноўную ўвагу ўдзяляла наладжванню выхаду з гета і адыходу ў лясы.

У яе склад уваходзілі камуністы І. Хмельнік, Л. Ліпскі, І. Рэйзнер, камсамольцы К. Любіч, Е. Чапнік, А. Руд і іншыя. Падпольшчыкі слухалі савецкае радые, затым распаўсюджвалі напісаныя ад рукі ці надрукаваныя на пішучай машынцы зводкі Саўінфармбюро. Група аказвала садзеянне асобам, якім пагражаў арышт, а таксама тым, хто імкнуўся пакінуць гета: дапамагала ім хавацца, падрабляла дакументы, здабывала зброю, компасы, карты.

У канцы 1942 - пачатку 1943 г. быў здзейснены шэраг спроб нелегальнага выхаду груп моладзі з гета і іх адыходу ў лес з мэтай далучэння да партызан.

З красавіка 1942 г. пачала дзейнічаць і падпольная група на заводзе па рамонту аўтамабільнай тэхнікі, якую ўзначаліў С. П. Лямаў. Падпольшчыкі выводзілі са строго маторы, электраабсталяванне, рамонтныя агрэгаты. З мая 1942 г. група С. П. Лямава ўзаемадзейнічала з групай В. Д. Разанава [1, с.99].

Дзейнасць антыфашысцкага падполля ў Гродне істотна актывізавалася пасля наладжвання сувязі з партызанскім атрадам "Кузнецкія металургі" (пазней "Камсамол Беларусі"), які ў чэрвені 1943 года прыбыў з-за лініі фронту на Гродзеншчыну. У мэтах папаўнення атрада, пры актыўным удзеле В. Д. Разанава, падпольная група якога налічвала ўжо каля 30 чалавек, у верасні было выведзена з горада больш як 25 падпольшчыкаў і іншых патрыетаў, якія ўліліся ў рады партызан.

У пачатку кастрычніка камандаванне атрада "Кузнецкія металургі" праз былых падпольшчыкаў перадало гарадскому падполлю ўказанні і рэкамендацыі па пашырэншо і актывізацыі яго дзейнасці. Падкрэслівалася неабходнасць узмацнення дыверсій на чыгуначным вузле, паколькі дзейнічаўчыя тут групы М. М. Багатырова і Г. І. Святлічнага спынілі існаванне. У адпаведнасці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атрыманымі рэкамендацыямі на чыгуначным вузле была створана падпольная група на чале з С. Ф. Панасюком, якая разгарнула актыўную дыверсійную дзейнасць. Паспяхова працягвала дзейнічаць на аўтарамонтным заводзе група С. П. Лямава. Узмацніла баявую дзейнасць група В. Д. Разанава. Яна наладзіла сувязі з партызанскімі атрадамі імя А. М. Матросава, "26 лет Октября", а таксама з разведвальна-дыверсійным атрадам "Таран", выконвала розныя заданні іх камандавання.

Удзельнікі ж антыфашысцкага падполля ў Гродне да самых апошніх дзен акупацыі працягвалі сваю самаадданую актыўную барацьбу з фашысцкімі захопнікамі [1, с.100].

З пачатку 1944 г. значную работу па разгортванню падпольнай барацьбы ў Гродне вялі Гродзенскі і Васілішкаўскі падпольныя РК КП(б)Б, Гродзенскі раенны антыфашысцкі камітэт, Гродзенскі падпольны ГК ЛКСМБ. Яны мелі цесныя кантакты з гарадскім падполлем, перадавалі яму ўзрыўчатку, агітацыйныяй матэрыялы, карысталіся атрыманай ад падпольшчыкаў інфармацыяй аб дзеяннях і намерах акупацыйпых улад.

Дакладна ўстаноўлена і дакументальна пацверджана, што ў гады Вялікай Айчынай вайны (1941-1944 гг.) на тэрыторыі горада Грода ў складзе антыфашысцкага падполля дзейнічала шэсць падпольных груп. У іх склад уваходзіла звыш 60 чалавек. З ліпеня 1943 года — падполле ў цэлым, уключаючы групы, дзейнічала пад кіраўніцтвам Беластоцкага падпольнага абкама КП(б)Б, а з лістапада 1943 г. актывізацыі дзейнасці падпольных груп садзейнічаў і Гродзенскі падпольны гаркам ЛКСМБ.Тры групы дзейнічалі на прадпрыемствах і ва ўстановах горада ( М.А. Волкава, В. Д. Разанава, С.П. Лямава), а тры - сярод чыгуначнікаў лакаматыўнага дэпо станцыі Гродна ( М. М. Багатырова, С. Ф. Панасюка і Г. І. Святлічнага). Менавіта яны ў перыяд акупацыі горада ўзначалілі барацьбу гараджан з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, арганізоўвалі правядзенне нелегальных сходаў, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, хавалі і лячылі раненых байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, збіралі зброю для партызанскіх атрадаў. Групы цесна ўзаемадзейнічалі між сабою. Пасля ўстанаўлення падпольшчыкамі сувязі на Гродзеншчыне ў 1943 годзе атрадамі імя Ленінскага камсамола (раней атрад называўся "Кузнецкія металургі"), "Камсамол Беларусі" і спецгрупай "Тарана” яны выконвалі іх заданні, здабывалі медыкаменты. перавязачныя матерыялы, аддзенне і абутак, якія разам са зброяй і боепрыпасамі перапраўлялі ў атрады.

Большасць падпольшчыкаў пры пагрозе раскрыцця іх дзейнасці найшлі ў партызанскія атрады.

**Літаратура**


1. Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941 – 1945 гг.). – Гродна, 1995. – 205 с.
2. Кравченко И.С., Крючок Р.Р. Подполье в западных областях Белоруссии // Герои подполья. – М.: Политиздат, 1972. – С. 267 – 398.
3. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Гродзен. р-на / Рэдкал. У.П. Верхась і інш. – Мн.: БелЭН, 1993. – 431 с.
4. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Краткие сведения об организационной структуре партийных соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. – Мн.: Беларусь, 1983. – 765 с.
5. Партийное подполье в Белоруссии, 1941 – 1944: Вилейская, Барановичская, Пинская, Брестская, Белостокская области. Страницы воспоминаний / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; Сост. Е.Н. Филатова и др. – Мн.: Беларусь, 1986. – 415 с.
6. Прытыцкі С.В. Партызанскі рух на Гродзеншчыне // Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Зб. успамінаў арганізатараў і актыўных удзельнікаў партызанскай вайны супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. – Мн.: Дзярж. выд-ва БССР, 1989. – С. 293 – 307.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ